WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 СНЕЖНЯ 2009 г. АЎТОРАК № 242 (26600)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## БОЛЬШ ЯК BR2 ТРЛН БУДЗЕ НАКІРАВАНА Ў 2010 ГОДЗЕ НА БУДАЎНІЦТВА 303 АБ'ЕКТАЎ У БЕЛАРУСІ

**У Беларусі на будаўніцтва 303 аб'ектаў у 2010 годзе будзе накіравана Br2145,7 млрд. Гэтыя сродкі прадугледжана накіраваць у адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2010 год, якую Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў 17 снежня ўказам № 636.**

З 303 аб'ектаў, якія плануюцца да ўзвядзення ў наступным годзе, 64 — новапачатыя. У эксплуатацыю будзе ўведзена 122 (уключаючы пускавыя комплексы).

Асноўнай крыніцай фінансавання праграмы з'яўляецца рэспубліканскі бюджэт.

Праграма сфарміравана ў адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы з улікам інвестыцыйных магчымасцяў рэспубліканскага бюджэту ва ўмовах бягучай эканамічнай сітуацыі і прапаноў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

Асноўнымі прынцыпамі фарміравання праграмы з'яўляецца канцэнтрацыя сродкаў на ўводзімых у эксплуатацыю аб'ектах, максімальна магчымая канцэнтрацыя сродкаў на пераходных аб'ектах з высокай ступенню іх будаўнічай гатоўнасці, а таксама ўключэнне аб'ектаў, забяспечаных зацверджанай ва ўстаноўленым парадку праектна-каштарыснай дакументацыяй.

У цэлым рэалізацыя праграмы дасць магчымасць забяспечыць увод у эксплуатацыю ў 2010 годзе марфалагічнага корпуса Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта; трэцяй і чацвёртай чэргаў РНПЦ «Маці і дзіця»; другой чаргі комплексу пагранічнай камендатуры з мабільнай пагранічнай заставай у Малорыце. Акрамя таго, будуць уведзены аўтадарожны пункт пропуску «Бенякані» ў Гродзенскай вобласці; будынкі судоў Драгічынскага, Рэчыцкага, Карэліцкага і Чарыкаўскага раёнаў; рэспубліканскі палігон для выпрабавання аўтатрактарнай тэхнікі ў Мінскім раёне (н.п. Азярышча); школа ў мікрараёне Білева-1 у Віцебску; вытворча-гандлёвы цэнтр народнай творчасці і рамёстваў у Копылі; навучальна-педагагічны комплекс «Сярэдняя школа на 720 месцаў і дзіцячы сад на 230 месцаў» у в. Бараўляны Мінскага раёна»; лядовы палац у Лідзе і іншыя аб'екты.

У наступным годзе плануецца завяршыць рэканструкцыю аперацыйнага блока хірургічнага корпуса Рэспубліканскага шпіталя МУС у г. Мінску; першай чаргі ДУ «РНПЦ гематалогіі і трансфузіялогіі»; будынка для размяшчэння суда Мінскага раёна па вул. Маякоўскага, 119а, у г. Мінску; двухпавярховага будынка з надбудовай паверха па Веласіпедным завулку, 10, у г. Мінску; будынка курсанцкай казармы Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь па вул. Каліноўскага, 4, у г. Мінску; чацвёртай чаргі аб'ектаў Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; памяшканняў пад стварэнне тэхналогіі і арганізацыі малатаннажнай вытворчасці новых фармацэўтычных субстанцый ДНУ «Інстытут біяарганічнай хіміі НАН Беларусі»; спартыўна-стралковага комплексу ў г. Гродна БФСТ «Дынама» і іншых аб'ектаў.

Будзе прадоўжана ў 2010 годзе будаўніцтва гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»; замкавага комплексу ў г.п. Мір; пятай чаргі РНПЦ «Маці і дзіця»; будынка дзіцячага лячэбна-аднаўленчага цэнтра пад вучэбна-лабараторны корпус Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта; спартыўна-стралковага комплексу Спартыўнага камітэта Узброеных Сілаў Беларусі; рэканструкцыя аб'ектаў БНТУ, БДУ, Нацыянальнага дзіцячага аздараўленчага лагера «Зубраня» і іншых аб'ектаў.

Акрамя таго, у 2010 годзе будзе пачата будаўніцтва інтэрнатаў №№ 2, 9 -14 комплексу «Студэнцкая вёска»; маласямейнага інтэрната для маладых вучоных і аспірантаў РУП «Інстытут пладаводства» ў пас. Самахвалавічы; усходняга абходу г. Гомеля; адміністрацыйнага будынка для Гомельскага пагранічнага атрада. У Полацку пачнуць будаўніцтва лячэбнага корпуса для размяшчэння радзільнага дома і хірургічнага аддзялення, пешаходнага моста цераз р. Заходняя Дзвіна ў зоне адпачынку ў раёне Кургана Бессмяротнасці і палаца гульнявых відаў спорту ў Віцебскім раёне Аэрапорт. Будзе таксама пачата рэканструкцыя лядовага палаца КСУП «Хакейны клуб «Хімік» Наваполацка і рэканструкцыя з рэстаўрацыяй касцёла Божага цела ў Нясвіжы і Свята-Васкрасенскага сабора ў Барысаве.

У цэлым жа ў 2010 годзе будзе пачата будаўніцтва 64 аб'ектаў, 40 з якіх уключаны ў праграму па даручэннях кіраўніка дзяржавы.

На будаўніцтва аб'ектаў па прамых даручэннях кіраўніка дзяржавы ў 2010 годзе будзе накіравана Br1913,8 млрд (з улікам мэтавых бюджэтных фондаў), або 89,2 працэнта ад аб'ёму фінансавання праграмы, з іх на аб'екты, якія ўводзяць у 2010 годзе, — Br667,6 млрд.

Такім чынам, сродкі рэспубліканскага бюджэту сканцэнтраваны на рэальных па ўводу ў эксплуатацыю ў 2010 годзе сацыяльна значных аб'ектах, а таксама на пераходных аб'ектах, прадугледжаных мэтавымі праграмамі, з высокай ступенню будаўнічай гатоўнасці для ўводу іх у эксплуатацыю ў наступныя гады. Будаўніцтва аб'ектаў прадугледжана толькі ў нарматыўныя або больш кароткія тэрміны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## Стварэнне адзінай мытнай прасторы паміж Беларуссю, Расіяй і Казахстанам лічаць перспектыўным 69,9 працэнта беларусаў

З іх 48,9 працэнта ацэньваюць яго як даволі перспектыўнае, 21 працэнт называюць вялікім крокам наперад. Такія даныя сацыялагічнага апытання, праведзенага Аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў цэнтры. Скептычна настроены да фарміравання Адзінай мытнай прасторы 28 працэнтаў апытаных: 17,1 працэнта мяркуюць, што яе стварэнне — рэкламны ход, а 10,9 працэнта не бачаць у ёй станоўчых момантаў. Не маюць уласнага пункту гледжання па гэтым пытанні 2,1 працэнта рэспандэнтаў.

Сацдаследаванне праводзілася ў лістападзе—снежні 2009 года. Былі апытаны 1,5 тыс. грамадзян у розных рэгіёнах Беларусі.

## Беларусь атрымае $688 мільёнаў

**У найбліжэйшыя дні ў Беларусь паступіць чарговы, чацвёрты, транш крэдыту МВФ у памеры каля 688 мільёнаў долараў ЗША, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення знешняй інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.**

Адпаведнае рашэнне прынята Выканаўчым Саветам фонду на пасяджэнні ў мінулую пятніцу, на якім было зацверджана завяршэнне трэцяга агляду рэалізацыі Праграмы стэнд-бай, што была заключана краінай з МВФ у студзені сёлета. Падставай для станоўчага рашэння паслужыла выкананне нашай краінай усіх абавязацельстваў, прынятых Беларуссю ў рамках Праграмы стэнд-бай. У Нацбанку падкрэсліваюць, што рэалізацыя згаданай праграмы ў мэтах яе поўнага выканання будзе працягнута, як і супрацоўніцтва з МВФ па рэалізацыі сумесных захадаў для мінімізацыі наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу і павышэння эфектыўнасці беларускай эканомікі.

Ігар ГРЫШЫН.



Маленькая мінчанка на сталічным крытым катку.

## РАЗАВАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ НІ ДА КАНЦА 2009 ГОДА, НІ Ў 2010-М НЕ БУДЗЕ

**Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі галоўнай банкаўскай установы краіны.**

Нацыянальны банк Беларусі плануе захаванне курсу беларускага рубля адносна кошыка валют як у канцы 2009-га, так і ў пачатку 2010 года на ўзроўні, што склаўся цяпер. Пры гэтым некаторыя ваганні двухбаковых курсаў беларускага рубля да долара ЗША, еўра або расійскага рубля могуць адбывацца толькі пад уплывам узаемных змяненняў курсаў гэтых замежных валют на сусветным рынку.

У далейшым, на працягу ўсяго наступнага года, прадугледжваецца падтрыманне курсу беларускага рубля да кошыка замежных валют у межах калідора ваганняў +/- 10 працэнтаў у адносінах да яе кошту, што склаўся да канца 2009 года. У той жа час з улікам прагназуемых параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця адхіленні курсу ад цэнтральнага значэння кошту кошыка валют на ўвесь 2010 год чакаюцца ў істотна меншым дыяпазоне, чым дапушчальныя +/- 10 працэнтаў.

## ІСТОТНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ НА ФОНЕ МОКРАГА СНЕГУ І ДАЖДЖУ

**На гэтым тыдні на тэрыторыі Беларусі зноў чакаецца рэзкая змена надвор'я, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Пачынаючы з серады, маразы адступяць. Пацяпленне прынясуць паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы. Павышэнне тэмпературы будзе суправаджацца істотным пагаршэннем надвор'я. Паўсюдна будуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі сур'ёзны галалёд, на дарогах галалёдзіца. Парывісты паўднёвы вецер. У сераду ўдзень тэмпература будзе ўжо ад 2 марозу да 4 цяпла. Увогуле, да канца тыдня захаваецца цёплае надвор'е, калі часам будзе ісці мокры снег, а ў асобныя дні і дождж. Сама цёпла чакаецца менавіта на свята 25 снежня, калі тэмпература павысіцца да 0 — плюс 6 градусаў. У суботу стане на 2—3 градусы халадней. У нядзелю ўслед за атмасферным фронтам з боку Заходняй Еўропы яшчэ крыху пахаладае. Пройдзе мокры снег. Тэмпература на працягу сутак — ад 0 да 7 марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

## БАЦЬКІ АДШУКАЛІ НЕЖЫВОГА СЫНА

**20-гадовага юнака позна ўвечары бацька з маці знайшлі ля дрэва ў лясным масіве Цнянскага вадасховішча: хлопец павесіўся.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашаў, устрывожаныя адсутнасцю сына, студэнта трэцяга курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, бацькі вечарам зайшлі ў яго пакой, дзе знайшлі на стале перадсмяротную запіску з планам-схемай. Кіруючыся апошняй, яны каля дзесяці вечара і адшукалі сваё дзіця. Праверкай гэтага факту цяпер займаецца пракуратура Савецкага раёна Мінска. Пакуль дакладна не вядома, што магло прымусіць юнака пайсці на такі крайні крок. Аднак, паводле адной з папярэдніх версій, магчыма, у студэнта былі пэўныя праблемы са здачай экзаменаў...

Ігар ГРЫШЫН.

## У МАГІЛЁВЕ ЛЕГАЛЬНА ГОНЯЦЬ САМАГОН

**Святочныя «100 грамаў» экалагічнага і якаснага прадукту па старадаўнім рэцэпце прапануюць у «Беларускай вёсцы XIX стагоддзя» пад Магілёвам.**



Самагонны апарат тут набылі даўно, але ліцэнзію на продаж атрымалі днямі. Напярэдадні першыя літры арыгінальнага алкагольнага напою «Карчма хлебная» паступілі ў разліў.

Самагоншчыцай у этнаграфічнай вёсцы стала магіляўчанка Ларыса Рыбак, якая трыццаць гадоў адпрацавала лабаранткай на хімічным прадпрыемстве. Яе скарацілі, але жанчына знайшла новую працу. Праўда, першым часам знаёмыя проста не маглі паверыць, што працоўны абавязак Ларысы — гнаць самагон.

— Наш напой 45—50 градусаў мацунку, — расказала яна. — Састаў: пшаніца, вада і дрожджы. Без цукру, каб галава ў людзей не балела. У нас галоўнае не колькасць, а якасць. Аналізы наш натурпрадукт прайшоў выдатна.

У хатцы самагоншчыцы пузатыя бутлі з празрыстай вадкасцю ўжо чакаюць прыхільнікаў народных алкагольных напояў. У рэстарацыі можна набыць 100 грамаў хлебнага самагону за 4860 рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

## У КЛІМАВІЦКІМ РАЁНЕ ЗГАРЭЛА СВІНАФЕРМА

**У вёсцы Хацень у выніку пажару загінулі 63 свінаматкі.**

Як паведамілі ў прэс-службе Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, паведамленне аб пажары паступіла а палове 6-ай раніцы. Калі тэхніка і выратавальнікі прыбылі на месца, будынак фермы гарэў увесь, а частка даху ўжо абрынулася. Будынак і жывёл выратаваць не ўдалося: узгаранне позна ўбачылі, моцны вецер раздуваў полымя. Згарэлі таксама тры трактары, грузавы і легкавы аўтамабілі.

У панядзелак на месцы працавала аператыўна-следчая група. Паводле папярэдняй версіі, прычынай пажару магло стаць парушэнне правілаў пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі электрычнага абагравальніка з адкрытымі награвальнымі элементамі. Урон падлічваецца: ён будзе вымярацца ў сотнях мільёнаў рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КОПЫЛЬСКИЙ МАСЛОСЫРЗАВОД»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже *имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод»,* расположенного по адресу: *г. Столбцы, ул. Свердлова, 3,* в составе зданий: производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, 201,7 кв.м, здание прачечной, об. пл. 109,6 кв.м, автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл. 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, *сооружений:* башня водонапорная, ограждение вокруг завода, *передаточных механизмов:* кабельные сети к силовому оборудованию, трасса газовая производственная 500 АЧ, сети связи воздушные, сети электроосвещения, сети канализационные, сети паропроводные, сети канализационные чугунные, а также *оборудования* и иного имущества согласно списку. **Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 700 119 485 бел. руб.** Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **19.01.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.01.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ СПК «АГРОФИРМА «ЛУЧНИКИ»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости в составе: **Лот № 1:** здание клуба, об. пл. 210,4 кв.м, Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Подлипцы. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 15 100 000 бел. руб. Пл. зем. уч. 0,1279 га. **Лот № 2:** здание коровника, об. пл. 1 404,4 кв.м, Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Павловка. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 63 082 890 бел. руб. Пл. зем. уч. 0,8642 га. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.08.09 г. Аукцион состоится **05.01.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.01.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Тваё правы

# «БЯСПЛАТНАЙ» ПРАЦЫ НЕ БЫВАЕ

**Змяншэнне аб'ёмаў вытворчасці, перспектыва рэарганізацый і скарачэння штатаў, замаруджванне росту ці нават змяншэнне заробкаў — вось галоўныя і не надта прыемныя асаблівасці гэтага года. А адсюль і павышэнне цікавасці да ўсяго, што звязана з працай. На якіх умовах можа адбывацца перавод работніка ў іншую мясцовасць, што трэба памятаць тым, хто вырашыў паспрабаваць сябе ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, і як скасаваць кантракт датэрмінова? Усё гэта стала тэмай чарговай on-line канферэнцыі, што была наладжана Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны. Такім чынам, на найбольш актуальныя сёння пытанні адказваюць начальнік упраўлення прававога забеспячэння і нагляду Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Алена Васільеўна КАМІСАРАВА, намеснік начальніка прававога забеспячэння і нагляду дэпартамента Вадзім Якаўлевіч БРАТАШ, кансультант дэпартамента Марына Іванаўна ГРЫШУКЕВІЧ і галоўны інспектар дэпартамента Аляксандр Аляксандравіч БУЛГАК.**

### ПЕРАВОД З ЧАСОВЫМ ЛІМІТАМ

Праблемы з «загрузкай» работнікаў абвастрыліся менавіта сёлета. І вырашаюць іх па-рознаму. Дзесьці ідуць на «плаўныя скарачэнні» і проста не працягваюць кантракты пасля заканчэння іх тэрміну. У некаторых арганізацыях пераходзяць на няпоўныя працоўныя дні, тыдні або практыкуюць «вымушаныя водпускі». Але калі-нікалі ідуць іншым шляхам і прапануюць... перавод на іншую працу.

— У выпадку прастою наймальнік мае права перавесці на іншую працу або да іншага наймальніка, — адзначаюць у дэпартаменце дзяржінспекцыі працы. — Разам з тым, тут існуе некалькі правілаў. Па-першае, часовы перавод павінен рабіцца з улікам прафесіі, спецыяльнасці, кваліфікацыі і пасады работніка на тэрмін да 6 месяцаў у «свайго» наймальніка і на тэрмін да месяца — да іншага наймальніка ў той жа мясцовасці. Што да аплаты, то пры часовым пераводзе ў сувязі з прастоем яна робіцца зыходзячы з работы, якая выконваецца. Пры гэтым, калі гаворка ідзе аб накіраванні на ніжэйаплатнае месца, за работнікамі, якія выконваюць нормы або пераводзяцца на «пагадзінную» сістэму, захоўваецца ранейшы сярэдні заробак. А калі нормы не выконваюцца, плацяць «па факце выканання» — але ніжэй за тарыфную стаўку.

### АДНАЎЛЕННЕ ЦІ МАРАЛЬНЫ ЎРОН?

Скасаванне кантракта пасля заканчэння яго тэрміну — момант заўсёды спрэчны. Аднак цяперашняе заканадаўства тут вызначае: пайсці на такі крок наймальнік можа. Праўда, той жа наймальнік павінен выканаць і пэўную працэдуру, скажам, пісьмова папярэдзіць работніка аб намеры развітацца не пазней чым за два тыдні. І якраз тут калі-нікалі з'яўляюцца неадназначныя нюансы. Пісьмовае папярэджанне работніку выдаюць. Але... за 12 дзён да звальнення.

Парушэнне заканадаўства ў гэтым выпадку відавочнае. Пытанне толькі, ці з'яўляецца яно падставай для аднаўлення на працоўным месцы? Так, практыка сведчыць, што звычайна ў падобных варунках у аднаўленні работнікам суды ўсё ж адмаўляюць. Аднак у такой сітуацыі работнік мае права звярнуцца ў суд з патрабаваннем... кампенсацыі маральнага ўрону. І тут шанцы выйграць справу нашмат большыя.

### НЯПЭЎНЫ ТЭРМІН «АЎТАМАТАМ»

«Кантрактная» тэма заўсёды вострая. І часам пікантная. Вось адна з сітуацый: тэрмін кантракта закончыўся, работніка не звольнілі, але ў той жа час... не прапанавалі падпісаць новы працоўны дагавор. Што далей?

— У гэтым выпадку работнік «аўтаматычна» пераводзіцца на бестэрміновы працоўны дагавор, — падкрэсліваюць у дэпартаменце. — Аднак працоўныя адносіны ўсё ж неабходна неяк урэгуляваць. Тут можна падпісаць як бестэрміновы дагавор, так і кантракт. Прычым апошняе таксама можа мець для работніка сэнс — тыя ж дадатковыя меры стымулявання, павелічэнне тарыфнай стаўкі і прадастаўленне «лішніх» дзён водпуску, магчымыя толькі пры кантрактнай форме найму.

### НАКОНТ НАДБАВАК ТРЭБА ДАМАЎЛЯЦЦА

Павелічэнне тарыфнай стаўкі або акладу да 50 працэнтаў і прадастаўленне да 5 дадатковых дзён водпуску пры заключэнні кантракта з'яўляецца ўмовай абавязковай. І тут не павінны быць выключэннямі тыя ж бюджэтныя арганізацыі. Аднак пытанне ўзнікае з іншым. Пры пераводзе на кантракт дадатковыя меры стымулявання работніку вызначаюць. А вось надбаўкі за складанасць і напружанасць працы — «зразаюць». Ці можа так быць?

Зрэшты, якраз тут парушэнняў з боку наймальнікаў можа і не быць. Умовы аплаты працы, і ў тым ліку надбаўкі за складанасць і напружанасць, вызначаюцца самастойна наймальнікам. І ці будуць давацца гэтыя надбаўкі работніку — залежыць ад узаемнай дамоўленасці пры заключэнні кантракта.

### ВАЖКІЯ ПАДСТАВЫ «РАЗВІТАЦЦА»

Нявыгадныя з пункту гледжання работніка ўмовы аплаты часта становяцца прычынай рашэння змяніць месца ўладкавання. Пры гэтым статыстыка сведчыць, што звальняюцца грамадзяне Беларусі перш-наперш якраз «па ўласным жаданні». Аднак раз-пораз тут узнікае праблема — цяперашні кантракт. Як скасаваць яго датэрмінова?

— Да заканчэння тэрміну дзеяння кантракт можна скасаваць паводле дамоўленасці бакоў, аднак калі такой дамоўленасці дасягнуць не ўдалося, то звольніцца нельга, — тлумачаць у дэпартаменце. — Разам з тым, у гэтай сітуацыі можна паспрабаваць спыніць працоўныя адносіны па іншых падставах, напрыклад, пры наяўнасці ўважлівых прычын, якія перашкаджаюць выкананню прафесійных абавязкаў — хвароба работніка або членаў яго сям'і, інваліднасць, змена месца жыхарства, дасягненне пенсійнага ўзросту і г.д.

Апроч таго, патрабаваць звальнення можна на падставе парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы або ўмоў кантракта. Адно, што вызначаць такія парушэнні павінен не сам работнік, а дзяржаўная інспекцыя працы, прафсаюзы або суд.

### АДНО МЕСЦА. ДЗВЕ ЗАРПЛАТЫ?

Пошук дадатковых заробкаў — з'ява нармальная. Аднак бываюць сітуацыі, калі «лішняя нагрузка» ёсць непасрэдна ў «сваёй» арганізацыі. Ці можна скарыстацца гэтай магчымасцю?

— Супрацоўнік мае права працаваць у арганізацыі па асноўным месцы і па сумяшчальніцтве адначасова, словам, выконваць у свой вольны час іншую працу, — заўважаюць у дэпартаменце. — І ў гэтым выпадку заканадаўства прадугледжвае толькі адно абмежаванне: уладкаванне па сумяшчальніцтве магчыма не больш чым на палову стаўкі. Прычым у плане атрымання дадатковых заробкаў у «сваёй» арганізацыі існуе яшчэ адзін варыянт — афармленне сумяшчэння прафесій з вызначэннем адпаведнай даплаты.

### І СВАЯКІ — НЕ ВЫКЛЮЧЭННЕ

Нарэшце, адным з някепскіх варыянтаў у няпростыя часы заўсёды было прадпрымальніцтва. Сёлета колькасць тых, хто вырашае распачаць сваю справу, сапраўды немалая. І ў тым ліку — дзякуючы спрошчанай працэдуры рэгістрацыі. Аднак таксама нялішне нагадаць: індывідуальны прадпрымальнік можа наймаць не больш чым трох фізічных асобаў, якія да таго ж павінны з'яўляцца блізкімі сваякамі — мужам або жонкай, бацькамі або дзецьмі, роднымі братамі або сёстрамі, дзедам, бабуляй або ўнукамі. І менавіта з улікам гэтага з'яўляюцца пытанні — ці абавязкова афармляць з блізкімі сваякамі працоўныя дагаворы? І ці можа індывідуал зноў жа дамовіцца са сваякамі і не плаціць ім зарплату?

Сваяцкія адносіны — нюанс сапраўды пікантны. Аднак нават з улікам гэтага заключыць працоўны дагавор з членамі сваёй сям'і індывідуальны прадпрымальнік усё ж абавязаны. І да таго ж — толькі ў пісьмовай форме.

Прычым апроч усяго ў працоўным дагаворы неабходна вызначыць асноўныя правы і абавязкі двух бакоў, рэжым працы і адпачынку, а таксама ўмовы аплаты — памер тарыфнай стаўкі, даплаты, надбаўкі, заахвочвальныя выплаты. Бо такога паняцця, як «бязвыплатная праца» ў заканадаўстве проста няма. Пры гэтым парушэнне таго ж працоўнага заканадаўства можа закончыцца адміністрацыйнай адказнасцю — штрафам ад 4 да 20 базавых велічыняў.

Сяргей ГРЫБ.

## ПАТУШНАЕ МЯСА ДАРАЖЭЕ

У Беларусі павышаны гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну патушную на 5 працэнтаў, свініну патушную — на 3 працэнты. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 194. Дакумент прыняты па прапанове Мінсельгасхарча ў мэтах кампенсацыі затрат на вытворчасць мяса.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.12.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 880,00 |
| 1 еўра | 4 122,14 |
| 1 латвійскі лат | 5 822,30 |
| 1 літоўскі літ | 1 192,15 |
| 1 чэшская крона | 156,37 |
| 1 польскі злоты | 981,78 |
| 1 расійскі рубель | 94,26 |
| 1 украінская грыўня | 361,36 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,5529 |
| UAH | 38,3108 |
| 1000 BYR | 10,6050 |
| EUR | 43,7854 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Антыкрызісная эканоміка

# «ГЭТА ВА ЎСІМ СВЕЦЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІК — ПАВАЖАНЫ ЧАЛАВЕК, ПАДАТКАПЛАЦЕЛЬШЧЫК. А Ў НАС ДАГЭТУЛЬ ВА ЎЯЎЛЕННІ МНОГІХ — ПРОСТА ГАНДЛЯР...»

**...На вуліцы, калі верыць прагнозу надвор'я, каля дзевяці гадзін раніцы было толькі 14 градусаў марозу. Аднак моцны пранізлівы вецер фактычна паніжаў тэмпературу паветра да адзнакі больш чым мінус 20. Таму купкі найперш прадаўцоў (так рана ў будны дзень без асаблівай патрэбы ў дарогу выправіцца рэдкі пакупнік, ды яшчэ пры такім надвор'і), «аддзяліўшыся» ад маршрутак і гарадскіх аўтобусаў, шпаркім маналітам «уцякалі» на тэрыторыю рынка ў Ждановічах, дзе імгненна разбрыдаліся кожны па сваім працоўным месцы пад дахам. Гэта каму пашчасціла працаваць у цяпле. Пакуль хвілін 10 чакаў калегу, ногі імгненна зайшліся ад холаду. Сэрца літаральна сціснула, калі праходзілі па адкрытай усім вятрам пляцоўцы, дзе корпаліся прадаўцы, усталёўваючы свае палаткі, раскладаючы тавар... Хутчэй хоць на нейкі час у цяпло! Накіроўваемся на крыты радыёрынак.**



...З пачатку года свет пабачыў шэраг дакументаў, скіраваных, калі гаварыць простымі словамі, на паляпшэнне ўмоў вядзення бізнэсу для індывідуальных прадпрымальнікаў. Можна, у прыватнасці, прыгадаць спрашчэнне працэдуры рэгістрацыі, змяншэнне колькасці праверак. Адносна нядаўна было заяўлена пра падтрымку тых індывідуальных прадпрымальнікаў, якія пажадаюць гандляваць беларускімі таварамі за межамі краіны. У наступным годзе павінен увайсці ў сілу дакумент, які звяжа стаўку арэнднай платы з памерам базавай велічыні.

Такім чынам, на працягу года індывідуальныя прадпрымальнікі жылі і працавалі ва ўмовах, якія пакрысе павінны былі змяняць і змяніць іх стаўленне да ўласнай справы, саміх сябе, дзяржавы. Калі гаварыць у шырокім сэнсе, павінны былі знікнуць тыя праблемы, што, паводле меркавання саміх жа прадпрымальнікаў, перашкаджалі нармальна працаваць. Ці адчулі ўсе гэтыя змяненні тыя, дзеля каго яны ўласна і ўводзіліся? Каб пачуць меркаванні прадстаўнікоў малога бізнэсу, мы і выправіліся ў Ждановічы. Куды, як не сюды, дзе і харчовы, і радыё-, і рэчавы, і будаўнічы рынкі разам?! Забягаючы наперад, адзначым, што прадпрымальнікі (і не толькі яны) па большасці даволі ахвотна ішлі на кантакт. Толькі адны былі гатовыя размаўляць пад уласным прозвішчам, іншыя ж былі гаваркімі толькі пры ўмове ананімнасці. Але мы вырашылі ўсіх суразмоўцаў «ураўнаважыць у правах» — не называць ніякіх імёнаў. Тым больш, што з кожным новым суразмоўцам рабілася відавочным: па вялікім рахунку, турбуе ўсіх прыкладна адно і тое ж.

СТАР. 3

# БІЗНЭС ПРОСІЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЦА З АРЭНДНЫМІ СТАЎКАМІ

Стварыць працоўную групу, каб патлумачыць прымяненне 518-га Указа Прэзідэнта «Аб некаторых пытаннях арэнды і бязвыплатнага карыстання маёмасцю», папрасілі Сяргея Сідорскага беларускія прадпрымальнікі. Адпаведны ліст ад Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальнікаў і Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў быў накіраваны на імя прэм'ер-міністра краіны. «Дзелавая супольнасць, прадстаўнікі прадпрымальнікаў рознага ўзроўню надзвычай занепакоены поўнай адсутнасцю інфармацыі па пытаннях арэндных плацяжоў у 2010 годзе. У сваю чаргу гэта стварае пэўную занепакоенасць прадпрымальнікаў няяснасцю ўмоў вядзення гаспадарчай дзейнасці ў 2010 годзе ў частцы планавання выдаткаў на арганізацыю вытворчай і кіраўніцкай дзейнасці, яе мэтазгоднасці», — напісана ў гэтым лісце.

Сутнасць у тым, што Указ Прэзідэнта № 518 ад 23 кастрычніка, які ўсталяваў адзіныя падыходы да вызначэння арэндных ставак і набывае моц 1 студзеня 2010 года, ліквідаваў Рэспубліканскую камісію па ўпарадкаванні выкарыстання адміністрацыйных будынкаў, а права тлумачыць пытанні прымянення гэтага Указа атрымаў Савет Міністраў. Але 1 студзеня ўжо літаральна на носе, а прадпрымальнікі так і не могуць знайсці адказаў на пытанне, якой жа будзе, у адпаведнасці з новым указам, арэндная плата ў 2010 годзе. Мы папрасілі пракаментаваць сітуацыю **Уладзіміра КАРАГІНА, старшыню ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў»**:

— Ужо хутка пачатак года, усе прадпрыемствы плануюць і заключаюць кантракты на сыравіну, матэрыялы, на вытворчасць і г.д. Крызіс сапраўды балюча ўдарыць па бізнэсу ў 2010 годзе, гэта другая хваля пасткрызісных з'яў. У нас разрываюцца тэлефоны, бо людзі пытаюцца, як плаціць арэнду. Ёсць шмат розных сітуацый, калі, напрыклад, у малым бізнэсе дырэктар сядзіць разам з бухгалтарам і інжынерам у кабінеце, а як вылічваць арэнду за гэтае памяшканне — ніхто не ведае, бо ніякіх інструкцый няма. Акрамя таго, нас турбуе высокая цана арэнднай платы, таму мы былі вымушаны звярнуцца да прэм'ер-міністра з прапановай тэрмінова стварыць працоўную групу. Чыноўнікі, якія атрымліваюць зарплату, ужо даўно і хутка павінны былі распрацаваць правілы гульні, а яны, здаецца, праспалі, бо ніякіх праектаў нам не паказвалі, вучэбных семінараў па арэндзе праведзена не было. Хоць трэба было б і іх правесці, і метадычкі распаўсюдзіць, і на сайце размясціць інфармацыю, бо ёсць шмат нетыповых сітуацый. Напрыклад, мы не ведаем зараз, як льгатуецца вытворчая дзейнасць — да гэтага, скажам, для вытворчасці быў каэфіцыент 0,7... Атрымліваецца сітуацыя, калі бізнэс кінулі на волю лёсу. Таму пра гэту сітуацыю ад імя асацыяцый і канфедэрацыі мы і далі сігнал нашаму прэм'ер-міністру, каб ён прыняў тэрміновыя меры. І нашыя сігналы не засталіся незаўважанымі — здаецца, цяпер ужо фарміруецца працоўная група.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# «ЦАРЫЦА» — КАНКУРЭНТ «КОЛЫ»?

**Прадукцыя прыватнага прадпрыемства «ВаМіЦа» з Ганцавічаў стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Лепшая прадукцыя года-2009».**



Доўгі час дырэктар прадпрыемства Валянціна Шуляк змагалася за месца пад сонцам для сваёй мінеральнай вады «Царыца». Канкурэнты наступалі з усіх бакоў. Нават на прылаўках крамаў свайго раёна даводзілася вытрымліваць націск «Дарыды», «Фроста», «Мінскай»...

Іншым разам цяжка нешта змяніць, бо шмат залежыць не толькі ад якасці прадукцыі і пажадання пакупніка, але і ад кіраўніцтва спажыўтаварыства ці той жа крамы. Якую прадукцыю завезлі — такая спажыўцам і прапануўваецца.

Валянціна Мікалаеўна нават з гэтай нагоды заходзіла да старшыні райвыканкама Уладзіміра Столяра. Маўляў, можа ён дапаможа, каб на тэрыторыі хоць свайго раёна заказчыкі аддавалі перавагу «Царыцы».

— Працуйце, шукайце выйсце, распрацоўвайце новыя віды прадукцыі. У пакупнікоў павінен быць шырокі выбар, — раіў у такіх выпадках Уладзімір Міхайлавіч. — Я не магу прымусіць загадчыкаў крамаў завозіць тую ці іншую прадукцыю — працуйце з імі самі.

І вось на рэспубліканскім конкурсе, першым для фірмы, дэманстравалася шэсць напояў, з якіх чатыры былі адзначаны журы конкурсу.

Безалкагольная газаваная «Царыца ірысава-сметанковая», «Царыца са смакам барбарысу», мінеральная лекава-сталовая «Царыца-1» і «Царыца-2» сталі пераможцамі ў сваёй намінацыі.

А канкурэнтамі на конкурсе «Лепшая прадукцыя года-2009» былі напоі шырока вядомых фірмаў, такіх, як «Кока-кола», «Фрост»...

А ці была гэтая перамога заканамернай?

— *На конкурсе дэманстравалася новая прадукцыя, мы спадзяваліся, што на яе звернуць увагу,* — разважае В. *Шуляк. — І вельмі прыемна, што не памыліліся. Радуе, што наша невялікае прадпрыемства з палескай глыбінкі засвяціліся на сталічным узроўні.*

— Сапраўды, «Царыца» ўжо канкурэнт «Кока-колы»?

— *Наша вада — пераможца ў сваёй намінацыі і стаіць на адным п'едэстале з «Кока-колай».*

— Валянціна Мікалаеўна, у свой час вы скардзіліся, што ёсць праблемы са збытам прадукцыі, найперш у сваім раёне. Пасля перамогі нешта змянілася?

— *Безумоўна, сітуацыя стала іншай. Мы шукаем спачатку пакупніка, а затым ён нас шукае. Але трэба ўлічваць, што для мінеральнай вады зіма не лепшы перыяд. Праўда, перад Новым годам адчуваецца ўздым. Накладвае свой адбітак і крызіс, але мы настроены аптымістычна і верым, што выстаім.*

Цяпер на фірме думаюць пра ўдзел у конкурсе «Прадукт года-2010». А чаму б з часам не выйсці і на міжнародны ўзровень і ўжо там нанесці паражэнне «Кока-коле»? Хто змагаецца, у таго ёсць надзея на перамогу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.** *Ганцавіцкі раён.*

Гандаль

# Добры настрой і зніжкі ў падарунак — з дастаўкай спажыўцу!

**У адпаведнасці з зацверджаным Міністэрствам гандлю Планам арганізацыйных мерапрыемстваў па гандлёвым і бытавым абслугоўванні насельніцтва ў перадснавагоднія, навагоднія і калядныя дні, у гэты перыяд будзе падоўжаны рэжым працы 5,1 тысячы гандлёвых аб'ектаў. Дарэчы, з пачатку года перагледжаны ў бок павелічэння на адну-дзве гадзіны рэжым працы больш за 6,5 тысячы крамаў. Акрамя таго за 11 месяцаў года 307 гандлёвых аб'ектаў у цэлым па краіне перайшлі на кругласутачны рэжым працы, у выніку на пачатак снежня налічвалася 446 такіх крамаў (на канец 2008 года працавала 139 кругласутачных крамаў).**

Як паведамілі ў міністэрстве, у передсвяточныя дні павялічылася зменнасць працы кулінарных, булачна-кандытарскіх цэхаў (іх усяго больш за 400), якія плануюць вырабіць не менш за 3 тысячы тон кулінарных, кандытарскіх вырабаў і паўфабрыкатаў, што дасць прырост тавараабароту да 25,5 мільярда рублёў. У аб'ектах грамадскага харчавання вядзецца прыём замоў на выраб кулінарных вырабаў і паўфабрыкатаў, мучных кандытарскіх вырабаў (тартоў, пірагоў і інш.) у тым ліку і з афармленнем па навагодняй тэматыцы.

З 22 снежня па 6 студзеня пройдуць выставы-продажы кулінарных, кандытарскіх вырабаў, салодкіх страў і дэсертаў у крамах і аддзелах кулінарыі, у холах рэстаранаў, кавярняў, сталовых, каля прахадных прамысловых прадпрыемстваў. Усяго будзе праведзена больш за 3 тысячы такіх выстаў-продажаў прадукцыі аб'ектаў грамадскага харчавання, у ліку якіх будуць і аўтарскія выставы майстроў-кухараў, майстроў-кандытараў. У школьных кавярнях пройдуць Дні ласуна для навучэнцаў пачатковых класаў і дыскатэкі для старшакласнікаў.

Распрацавана каля 56 відаў навагодніх падарункаў розных відаў і формаў, з утрыманнем ласункаў ад 300 грамаў да 2,5 кілаграма па цане ад 6 да 65 тысяч рублёў. Выпушчаны таксама новыя віды навагодніх падарункаў у выглядзе мяккіх цацак, якія сімвалізуюць надыходны год Тыгра.

Дасягнутая дамоўленасць з вытворцамі краіны адносна максімальнага выканання замоў арганізацый гандлю на пастаўку алкагольных напояў у шырокім асартыменце. Плануецца, што ў чацвёртым квартале гэтага года на ўнутраны рынак будзе пастаўлена 324,2 тысячы дэкалітраў шампанскага і вінаў пеністых вытворчасці ААТ «Мінскі завод пеністых вінаў», што на 11 працэнтаў больш, чым было летась (292 тысячы дэкалітраў).

Напярэдадні навагодніх і калядных святаў гандлёвымі арганізацыямі сумесна з вытворцамі будуць праведзены выставы-продажы з дэманстрацыяй мадэляў адзення, распродажы са зніжэннем рознічных цэнаў ад 5 да 30 працэнтаў, рознага кшталту рэкламныя акцыі па стымуляванні продажаў і забаўляльныя мерапрыемствы з тэатралізаванымі паказамі Дзеда Мароза, Снягуркі, казачных персанажаў. Пераважна зніжкі на нехарчовыя тавары будуць давацца гандлёвымі арганізацыямі самастойна, за кошт зніжэння гандлёвай надбаўкі на 10—15 працэнтаў.

У асобных рэгіёнах з прадпрыемствамі-вытворцамі прапрацаваны пытанні правядзення сумесных акцый па зніжэнні адпускных цэнаў. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці такая дамоўленасць ужо ёсць з Гродзенскім кансерваным заводам (зніжка на яго прадукцыю складзе 5 працэнтаў), «Гроднахлебапрадуктам» (зніжка — 10 працэнтаў), «Спартаком» (зніжка да адпускной цаны — ад 5 да 20 працэнтаў) і іншымі.

Усяго плануецца правесці больш за 6,8 тысячы кірмашоў, выстаў-распродажаў, у тым ліку ўзгаданых распродажаў па зніжаных цэнах, рэкламных акцый. Прадугледжана таксама арганізацыя латарэй, уручэнне заахвочвальных прызоў, апроч гэтага — дэгустацыя новых відаў харчовых тавараў беларускіх вытворцаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У ЗІМОВУЮ КАЗКУ — НА НАВАГОДНІМ ЭКСПРЭСЕ

**З 25 снежня па 10 студзеня па Дзіцячай чыгунцы ў сталіцы будзе курсіраваць фірмовы цягнік «Навагодні экспрэс».**

Бацькам з дзецьмі прапануецца інтэрактыўнае тэатралізаванае падарожжа ў навагоднім утульным «вагончыку» па заснежаным лесе, дыскатэка ў Бабы Ягі, сустрэчы з казачнымі героямі і, безумоўна, з Дзедам Марозам і Снягуркай. Прычым сцэнарый мерапрыемства пабудаваны такім чынам, запэўніваюць арганізатары, што кожны пасажыр цягніка літаральна з першых хвілін падарожжа стане не пасіўным назіральнікам, а самым што ні ёсць актыўным удзельнікам тэатралізаванай дзеі... Працягласць «падарожжа ў зімовую казку» — 1 гадзіна 10 хвілін. Кошт білета — 10 тысяч рублёў (у тым ліку і для дзяцей).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## А ШТО ДУМАЮЦЬ ПАСАЖЫРЫ?

**Рэканструкцыя Гродзенскага чыгуначнага вакзала будзе ажыццяўляцца з улікам меркаванняў пасажыраў. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў намеснік начальніка Баранавіцкага пасажырскага ўчастка па чыгуначнай станцыі Гродна Мікалай Дудогла.**

На другім паверсе вакзала ўсталяваная скрыня для прапаноў па ўнутранай «начынцы» будынка. Што людзі хацелі б там бачыць? Кавярню? Нейкія забаўляльныя паслугі? Пункты хуткага рамонту адзення? Ці нешта яшчэ? Мяркуецца, што ўсе пажаданні (яны ўжо паступаюць) будуць разгледжаны пасажырскай службай станцыі Гродна, а затым улічаны праекціроўшчыкамі.

Акрамя таго, паведаміў Мікалай Дугойла, вырашана пацікавіцца меркаваннем пасажыраў наконт аднаўлення чыгуначных зносінаў паміж Гродна і Вільнюсам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|
| Наименование объекта | Право аренды земельного участка | | | |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Дятловский район, г. Дятлово, ул. Мицкевича, д. 16 | Гродненская область, Дятловский район, г. Дятлово, ул. Победы, д. 9Б | Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Октябрьская, д. 1 | Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Ленина, д. 26 Б |
| Кадастровый номер | 422350100002000923 | 422350100002000721 | 422356300002000348 | 422356300002000564 |
| Площадь участка (га) | 0,0700 | 0,0049 | 0,0050 | 0,0050 |
| Форма проводимого аукциона | Аукцион без условий | | | |
| Срок аренды | Аренда 50 лет | Аренда 5 лет | | |
| Условия продажи | Строительство магазина | Размещение торгового павильона | | |
| Возмещение потерь сельскохозяйственного производства (руб.) | 1779000 | – | – | – |
| Начальная цена (руб.) | 7112990 | 334315 | 99878 | 80240 |
| Сумма задатка (руб.) | 711300 | 33500 | 10000 | 8100 |
| Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона и подготовкой документации (руб.) | 668688 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 608642 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 590671 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 600621 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) |

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:**

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

- заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602515007741 в филиале № 416 АСБ «Беларусбанк» г.Новогрудок ЦБУ 407, код 698, УНП 500049290, код платежа: 1) по продаже права аренды земельного участка – 4002; получатель платежа – финансовый отдел Дятловского райисполкома.

**Гражданин** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

**Юридическое лицо** – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Юридическое лицо** – нерезидент Республики Беларусь (принимает участие в аукционе только на право аренды земельного участка)– представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**Представитель иностранного гражданина** (принимает участие в аукционе только на право аренды земельного участка) – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомится с объектами.

**Аукцион состоится 26 января 2010 года в 11.00 по адресу: г. Дятлово, ул. Красноармейская, 3, в зале заседаний.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина,18, каб. 9 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Телефоны для справок в г. Дятлово: 8 01563 21778, 21610.

Заявления принимаются по 22 января 2010 года до 17.30 включительно.




Фота Васіля ЗЕНЬКО.


ООО «Белсоюзопт» (регистрационный № 190548835) настоящим уведомляет о реорганизации путем разделения.
Тел. 290 05 81.
*УНП 190548835*



У **суд Мазырскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Бірукова Мікалая Аляксандравіча**, 29 сакавіка 1972 года нараджэння, ураджэнца г. Красназаводск, РФ, апошняе вядомае месца жыхарства якога: вул. Сацыялістычная, д. 83, кв. 34, г. Мазыр Гомельскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Бірукова М.А., паведаміць іх суду Мазырскага раёна (г. Мазыр, вул. Саета, 2) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**проводит 1-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности 27 января 2010 года**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи партии (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | Автошасси Урал-375 ш. 343797 дв. 319088 с кунгом К-375 № 01115 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1980 | 7011 | 7 000 000 | 700 000 |
| 2. | Автошасси Урал-375 ш. 281563 дв. 745594 с кунгом К-375 № 10064 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1978 | 8029 | 7 000 000 | 700 000 |
| 3. | Автошасси Урал-375 ш. 353239 дв. 380515 с кунгом К-375 № 05043 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1981 | 2744 | 7 500 000 | 750 000 |
| 4. | Автошасси Урал-375 ш. 380473 дв. 685636 с кунгом К-375 № 05594 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1982 | 6496 | 7 500 000 | 750 000 |
| 5. | Автошасси Урал-375 ш. 278266 дв. 718216 с кунгом К-375 № 08148 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1978 | 10271 | 7 000 000 | 700 000 |
| 6. | Автошасси Урал-375 ш. 432307 дв. 299688 с кунгом К1-375 № 12051 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1984 | 2270 | 8 000 000 | 800 000 |
| 7. | Автошасси Урал-375 ш. 439204 дв. 423547 с кунгом К1-375 № 08221 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1985 | 1031 | 8 500 000 | 850 000 |
| 8. | Автошасси Урал-375 ш. 365876 дв. 541044 с кунгом К-375 № 07108 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1981 | 1860 | 7 500 000 | 750 000 |
| 9. | Автошасси Урал-375 ш. 418828 дв. 096048 с кунгом К1-375 № 02133 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1984 | 1032 | 8 000 000 | 800 000 |
| 10. | Автошасси Урал-375 ш. 314730 дв. 048064 с кунгом К-375 № б/н | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1979 | 2532 | 7 000 000 | 700 000 |
| 11. | Автошасси Урал-375 ш. 423999 дв. 180509 с кунгом К-375 № 06076 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1984 | 1003 | 8 000 000 | 800 000 |
| 12. | Автошасси Урал-375 ш. 338430 дв. 269643 с кунгом К-375 № 11144 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1980 | 1004 | 7 500 000 | 750 000 |
| 13. | Автошасси Урал-375 ш. 424924 дв. 192767 с кунгом К1-375 № 09044 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1984 | 2437 | 8 000 000 | 800 000 |
| 14. | Автошасси Урал-375 ш. 366597 дв. 549666 с кунгом К-375 № 12086 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1981 | 1173 | 7 500 000 | 750 000 |
| 15. | Автошасси Урал-375 ш. 336386 дв. 253248 с кунгом К-375 № 11059 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1980 | 1022 | 7 500 000 | 750 000 |
| 16. | Автошасси Урал-375 ш. 378204 дв. 665219 с кунгом К-375 № 05595 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1982 | 1191 | 8 000 000 | 800 000 |
| 17. | Автошасси Урал-375 ш. 336683 дв. 237396 с кунгом К-375 № 11145 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1980 | 980 | 7 500 000 | 750 000 |
| 18. | Автошасси Урал-375 ш. 340879 дв. 286397 с кунгом К-375 № 11156 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1980 | 1080 | 7 500 000 | 750 000 |
| 19. | Автошасси Урал-375 ш. 312946 дв. 999967 с кунгом К-375 № 12117 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1979 | 1003 | 7 000 000 | 700 000 |
| 20. | Автошасси Урал-375 ш. 370292 дв. 585688 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1982 | 1032 | 8 000 000 | 800 000 |
| 21. | Автошасси Урал-375 ш. 372253 дв. 598805 | г. Молодечно, ул. Замковая в/ч 04152 | 1982 | 1220 | 8 000 000 | 800 000 |

**Аукцион состоится в 11.00 27 января 2010 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6 этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается **в 17.00 25 января 2010 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 27 января 2010 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт» 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 20 01. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com**



## Управляющий КХ «АГРОСВЕТ» (г. Смолевичи) повторно проводит 22 января 2010 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15 открытый аукцион по продаже имущества КХ «Агросвет»

Задаток по лоту — согласно перечня имущества — перечисляется на р/с 3012020543528 в ф-ле № 616 АСБ «Беларусбанк», ЦБУ № 621 г. Смолевичи, код 812. Для участия по всему перечню необходимо внести задаток в размере суммы задатка по лоту № 1.

Для участия в аукционе в срок до 15 января 2010 г. по адресу: г. Минск, а/я 76 управляющему КХ «Агросвет» Павловичу А.Г. (тел. 8 029 654 58 48, 8 029 161 62 63) предоставляются следующие документы:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием лота.

2. Платежный документ с отметкой банка о внесении задатка.

3. Заверенные копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя).

Аукцион проводится с понижением первоначальной стоимости имущества на шаг аукциона (2 % от первоначальной стоимости имущества) до минимальной стоимости (80 % от первоначальной стоимости имущества). В случае готовности более чем 1 участника приобрести имущество по объявленной цене, цена пошагово повышается. Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за лот наиболее высокую цену. Договор купли-продажи имущества заключается в день проведения торгов.

**Перечень выставляемого на торги имущества:**

| № лота | Наименование | Стоимость с НДС | Сумма задатка | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомат для розлива вина | 28 528 098 | 1 426 410 | 570 562 |
| 2 | Емкость | 194 306 | 9 720 | 3 886 |
| 3 | Емкость V-75 | 5 961 670 | 298 080 | 119 233 |
| 4 | Емкость V-75 | 5 464 864 | 273 240 | 109 297 |
| 5 | Инспекционная машина | 8 298 914 | 414 950 | 165 978 |
| 6 | Компрессор | 168 597 | 8 430 | 3 372 |
| 7 | Машина фасовочная для пищевых жидкостей Д9-ВРЕ-6 | 4 421 010 | 221 050 | 88 420 |
| 8 | Мерник технический 750 л | 1 109 759 | 55 490 | 22 195 |
| 9 | Машина бутылкомоечная, в том числе электроблок контроля и управления ТН 002297) | 8 940 622 | 447 030 | 178 812 |
| 10 | Насос для перекачивания вина ВНЦ (разобранный вид) | 782 693 | 39 140 | 15 654 |
| 11 | Принтер «Вилет» 3820 | 989 510 | 49 480 | 19 790 |
| 12 | Стальная емкость V-25 | 4 377 238 | 218 860 | 87 545 |
| 13 | Транспортер для ящиков 1 | 4 679 698 | 233 990 | 93 594 |
| 14 | Транспортер для ящиков 2 | 5 005 695 | 250 290 | 100 114 |
| 15 | Транспортер для ящиков 3 | 4 505 124 | 225 260 | 90 102 |
| 16 | Транспортер цепной для бутылок | 2 461 133 | 123 060 | 49 223 |
| 17 | Установка для приготовления сиропа | 3 987 908 | 199 400 | 79 758 |
| 18 | Цистерна НЦПУ 9370 | 1 787 438 | 89 370 | 35 749 |
| 19 | Электронасос 63/20 | 646 068 | 32 300 | 12 921 |
| 20 | Электронасос 125/20 | 153 899 | 7 700 | 3 078 |
| 21 | Электроблок учета стеклотары ЭСУ | 1 171 620 | 58 580 | 23 432 |
| 22 | Установка для укупоривания бутылок | 3 506 921 | 175 350 | 70 138 |


# Купіў сотавы, а ён не працуе? Спажывец можа за яго «пазмагацца»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**«2 лютага 2008 года мной быў набыты мабільны тэлефон Soni Ericson у краме «Тэхнасвет» горада Салігорска (вуліца Заслонава, 54а) коштам 595 020 рублёў. Тэрмін гарантыі на яго складаў 12 месяцаў, тэрмін службы — 24 месяцы. Тэлефон зараз не працуе і ў майстэрні сказалі, што рамонт немагчымы. Ці маем мы якія-небудзь правы ў гэтай сітуацыі? Якім чынам можна яе вырашыць?»**

Такім было чарговае пытанне, што паступіла ад чытача па нашай «гарачай лініі». Каб даць на яго кампетэнтны адказ, мы звярнуліся з просьбай аб дапамозе ва ўпраўленне абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю.

«У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» ад 9 студзеня 2002 года, спажывец у выпадку выяўлення ў тавары недахопу вытворчага характару мае права патрабаваць ад прадаўца аднаго з наступных дзеянняў: замены недабраякаснага тавару таварам належнай якасці; супастаўляльнага змяншэння пакупной цаны тавару; бясплатнага рамонту, пакрыцця выдаткаў на рамонт; вяртання грошай за няякасны тавар. Названыя патрабаванні могуць быць прад'яўлены прадаўцу на працягу гарантыйнага тэрміну, а калі такі тэрмін складае менш за два гады — на працягу двух гадоў», гаворыцца ў адказе, падпісаным намеснікам міністра гандлю Ірынай НАРКЕВІЧ.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што гарантыйны тэрмін на сотавы тэлефон скончыўся 3 лютага 2009 года, спажывец мае права звярнуцца да прадаўца (крама «Тэхнасвет») з прэтэнзіяй на якасць тавару (не скончыўся двухгадовы тэрмін) і прад'явіць адно з названых вышэй патрабаванняў. Разам з тым варта адзначыць, што сотавы тэлефон з'яўляецца тэхнічна-складаным таварам і, адпаведна, замена такога тавару магчымая толькі ў выпадку выяўлення яго істотных недахопаў.

Далей у адказе з міністэрства тлумачыцца, што прадавец абавязаны прыняць тавар неналежнай якасці ад спажыўца і пры неабходнасці правесці праверку якасці тавару. Пры правядзенні такой праверкі прадавец абавязаны праінфармаваць спажыўца адносна яго права на ўдзел у праверцы якасці тавару, а калі такая праверка не можа быць праведзена неадкладна — таксама пра месца і час правядзення такой праверкі. Як правіла, праверка якасці тавару праводзіцца сэрвіснымі цэнтрамі. Калі спажывец не згодны з вынікамі праверкі якасці (не пацвердзіўся недахоп у тавары ці ва ўзнікненні недахопу вінаваты сам спажывец), дык у такім выпадку для вырашэння спрэчкі праводзіцца экспертыза якасці тавару. Па заканчэнні гарантыйнага тэрміну пошукам экспертнай арганізацыі займаецца спажывец, але аплачвае яе прадавец. Таксама спажывец мае права правесці экспертызу за свой кошт. Аднак неабходна мець на ўвазе, што, калі ў выніку экспертызы тавару будзе вызначана, што недахопы адсутнічаюць ці спажыўцом парушаны вызначаныя правілы карыстання, захоўвання, транспарціроўкі тавару, дык спажывец будзе абавязаны пакрыць прадаўцу выдаткі на правядзенне экспертызы, а таксама звязаныя з яе правядзеннем выдаткі на транспарціроўку тавару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Факт

## СЁЛЕТА Ў СТАЛІЦУ З МЭТАЙ ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ ПРЫБЫЛІ 2479 ЗАМЕЖНІКАЎ

Колькасць мінчан, якія шукаюць заробку за мяжой, практычна такая ж, як і колькасць замежных грамадзян, якія прыязджаюць у беларускую сталіцу з той жа мэтай.

Так, у гэтым годзе за мяжу адправіўся 2561 працоўны мігрант з Мінска, да нас жа прыбылі 2479 замежнікаў. 1238 нашых суайчыннікаў шукаюць шчасця ў Расіі, 1163 — у ЗША, астатнія — у Чэхіі, Польшчы, ААЭ, ФРГ, Літве і нават Катары. У Мінску працуюць у асноўным кітайскія, в'етнамскія і турэцкія спецыялісты, сярод якіх пераважаюць прадстаўнікі будаўнічых спецыяльнасцяў. Акрамя гэтага многія знайшлі сябе ў сферы грамадскага харчавання, адукацыі, індывідуальнага прадпрымальніцтва.

Паводле звестак УГіМ ГУУС Мінгарвыканкама, цяпер у сталіцы знаходзяцца на ўліку 347 чалавек, прызнаных бежанцамі ў Рэспубліцы Беларусь. Пераважную большасць з іх складаюць грамадзяне Афганістана (302), ёсць таксама прадстаўнікі Эфіопіі, Ірана, Палесціны, Ліберыі, а таксама краін блізкага замежжа — Грузіі, Таджыкістана і Азербайджана.

**Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».**

ЗВЯЗДА 22 снежня 2009 г.


Генеральны дырэктар Наталля МАНЬКО.

**Гісторыя прадпрыемства пачынаецца з 1946 года, калі адбудавалі млынзавод № 21 і рэалізацыйную базу «Загатзбожжа». Вось з таго часу, крок за крокам, з году ў год, прадпрыемства сталела і развівалася. Вялося будаўніцтва, пашыралася вытворчасць, узводзіліся ў эксплуатацыю новыя цэхі і ўчасткі...**

**Але найбольшая рэарганізацыя Баранавіцкага камбіната хлебапрадуктаў адбылася, калі ў 2005 годзе да прадпрыемства далучылі свінакомплекс «Усходні», на якім утрымліваецца 69 тысяч свіней. Комплекс па вытворчасці свініны — гэта буйны ўчастак з законченым цыклам вытворчасці.**

**У наступным, 2006 годзе, камбінат хлебапрадуктаў у выніку далучэння да яго двух сельгаскааператываў (СВК «Лотвічы» і «Вераснёвы») атрымаў 5,7 тыс. гектараў зямлі, а калектыў камбіната павялічыўся на 290 работнікаў.**

**Сёння ААТ «Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» — сучаснае аграпрамысловае прадпрыемства, якое працягвае рэарганізоўвацца і развівацца.**

**Апошні раз «Звязда» пабывала на камбінаце год таму, але і за гэты, даволі кароткі перыяд, тут адбыліся значныя перамены. Аднак пра гэта ніжэй. А пакуль што нас чакае размова з генеральным дырэктарам прадпрыемства Наталляй Манько, якая 32 гады адпрацавала на камбінаце і амаль дзесяць з іх на пасадзе кіраўніка. Фактычна, усё працоўнае жыццё аддадзена прадпрыемству, на якім Наталля Віктараўна і правяла самую сур'ёзную рэарганізацыю.**

**Сёння Наталля Манько не толькі генеральны дырэктар, але і сенатар. Ці не празмерная ноша для жанчыны, у якой сям'я, дзеці?..**

**Жыццё шматграннае, і ў кожным чалавеку адлюстроўваецца яно ў адпаведнасці з яго характарам, мараллю, інтэлектам...**



# ПРАЦАВАЦЬ, КАБ ЖЫЦЬ ДАСТОЙНА

## ААТ «БАРАНАВІЦКІ КАМБІНАТ ХЛЕБАПРАДУКТАЎ»



### ВАЖНА БЫЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫМ

**— Наталля Віктараўна, якім для вас быў мінулы год? Я маю на ўвазе мінулыя месяцы 2009-га і другую палову 2008 года...**

— У цэлым, наракаць няма чаго — год быў нармальным. На прадпрыемстве адбыліся за гэты перыяд значныя зрухі, праведзена мадэрнізацыя, узведзены новыя аб'екты, і ўсё гэта вам пакажуць. Хачу толькі падкрэсліць, што заслуга тут усяго нашага калектыву. Праца мае вялікае значэнне для чалавека, але яна ўсё ж толькі адна са складнікаў нашага жыцця.

**— Іншым разам бывае сумна размаўляць з чалавекам, які зацыкліўся на працы. Ствараецца ўражанне, што ён губляе нешта важнае. У вас не бывае адчування нечага незваротна страчанага? Днём на камбінаце, і ноччу міжволі думкі круцяцца наўкол працы, і так з дня ў дзень.**

— Трэба ўспрымаць жыццё такім, якое яно ёсць. Прачнуўся раніцой, убачыў сонца — і ўжо радасна. А хіба сваё здароўе ці здароўе блізкіх ужо не важна? Жыццё — сінусападобная лінія. Хваля дасягнула вяршыні, а затым апусцілася, такая перыядычнасць ці цыклічнасць — заканамерныя ў жыцці. Але я асцерагаюся празмернай радасці, як і тугі. А ўвогуле мы не маем права сумаваць.

**— Для кіраўніка гэты момант важны?**

— У мяне калектыў — каманда, з якой працую. І калі з падначаленымі не пагаварыла, не падпусціла да сябе, то яны пачынаюць хвалявацца. І гэта зразумела пачалавечы, кожны думае, што дырэктар не задаволены ім, настроены супраць яго... А неабходна, каб людзі працавалі, не хваляваліся з-за настрою дырэктара.

**— Ваша каманда — гэта хто? Угоднікі — людзі, гатовыя ўгадаць ваша жаданне? І такія бываюць у кіраўнікоў каманды.**

— Праца і прафесіяналізм работніка — самае важнае. І няхай нехта будзе хоць тройчы ўгоднікам, але калі лямку не цягне, то пытанне закрытае. Калі я пакідаю на пэўны час прадпрыемства, то павінна быць упэўненая, што на ім збояў не будзе. Я за тое, каб ініцыятыва зыходзіла знізу... Стараюся давяраць людзям. Прыкладна два месяцы таму з'явіўся ў мяне новы намеснік. У яго даволі складаны ўчастак — сельская гаспадарка. Няхай чалавек папрацуе, я спадзяюся, што ў яго ўсё атрымаецца, будзе вынік.

**— Наталля Віктараўна, вы працуеце ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, як кіраўніку прадпрыемства вам ёсць нейкая аддача ці нічога не змянілася?**

— Безумоўна, аддача ёсць. Новыя людзі, кантакты, наладжваюцца сувязі, якія дапамагаюць вырашаць і вытворчыя пытанні. У наш час сядзець на «сваёй кухні», калі ты не хочаш апынуцца на абочыне, не выходзіць. А яшчэ да мяне ідуць людзі са сваімі праблемамі і просяць дапамогі, а гэта зноў жа кантакты, але ўжо на іншым узроўні.

**— Удаецца дапамагчы?**

— У межах сваіх магчымасцяў. У людзей бываюць самыя нечаканыя пытанні і праблемы. Але ж тут прыходзіцца дзейнічаць у рамках існых законаў. І важна чалавеку ўсё растлумачыць і нават калі ён атрымлівае адмову, то ў такім выпадку будзе не дужа засмучаным.

**— Відавочна, вы ўжо сталі добрым псіхолагам?**

— Хацелася б быць лепшым, бо іншым разам і не ўдаецца разгледзець чалавека з першага погляду. Вось, здараецца, і ўзнікаюць пытанні пры прыёме на працу ці звальненні. А ў асноўным відаць, хто шчыра да цябе ставіцца, як да чалавека, а хто бачыць у табе дырэктара. Іншым разам дабрынёй карыстаюцца.

**— Дабро і зло — гэта ў чалавека закладзена ад нараджэння ці нажыўное — вызначанае быццём?**

— Думаю, што тут існуе нейкі баланс. Калі чалавек робіць дабро, то яно да яго і вернецца. Хто людзям творыць бяду, наўрад ці будзе шчаслівым. Жыццё паказвае, што генетыка тут адыгрывае вялікую ролю. Перайначыць прыроду цяжка. Што чалавек узяў ад бацькоў і дзядоў, тое ў ім і застаецца. Асабіста на мяне вялікі ўплыў зрабіла сям'я. Прыязджаю да бацькі, а яму ўжо пад восемдзясят, і ён пачынае мяне вучыць жыць. Прыслухалася і бачу, што ў словах бацькі ёсць рацыянальнае зерне. Яго не хвалюе, хто ва Украіне стане прэзідэнтам, а вось цана на хлеб для яго важная. Вось і я разумею, што самае вялікае багацце — гэта хлеб. Няхай у кожнага будзе свой крыж, але няхай будзе і вынік. Чалавек абавязаны мець стрыжань і яшчэ быць запатрабаваным.

**— Наталля Віктараўна, але ж запатрабаванасць — паняцце даволі размытае. Час няўмольны...**

— А гэта вызначаецца ўнутраным станам чалавека. Да нас на розныя сустрэчы і мерапрыемствы прыходзяць мае папярэднікі — былыя кіраўнікі камбіната. І радуе, што яны жывыя людзі, нешта могуць параіць, падказаць... Безумоўна, адарвацца ад калектыву, з якім звязаны такі перыяд жыцця, няпроста, але ж... А пакуль у мяне ёсць час, то хацелася б падрыхтаваць сабе замену і ўвогуле, я яшчэ не спынілася і хачу паспець у жыцці многае зрабіць.

**— Неўзабаве надыдзе Новы год. Чаго вы чакаеце ад наступнага, 2010, года?**

— Мінулы год для прадпрыемства быў складаны, але калектыў выстаяў. Я веру і спадзяюся, што мы зможам пераадолець усе цяжкасці і ў нас будуць яшчэ выдатныя дасягненні.

**Карыстаючыся магчымасцю, я хачу павіншаваць работнікаў прадпрыемства, а таксама нашых партнёраў, з якімі мы працуем, з надыходным Новым годам, хачу падзякаваць ім за натхнёную працу. Ва ўсім, чаго нам удалося дасягнуць, ёсць заслуга кожнага з вас.**

**Дабра вам і вашым сем'ям у новым, 2010, годзе!**


Галоўны тэхнолаг Алена БАРЫСЕВІЧ.


Адзіная ў краіне лінія сушкі зародкаў шматкоў пшаніцы.




Намеснік вытворча-тэхнічнай лабараторыі Святлана ІВАНОВА і інжынер-лабарант Ніна ГУЛЬКО вызначаюць паказчыкі бяспекі прадукцыі і сыравіны.


Зміцер АРЦЮХ, намеснік галоўнага інжынера.


Апаратчыкі апрацоўкі зерня Аляксандр ДРЫК і Аляксандр ШАМКУЦЬ.


Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Ірына КАРКОЦКАЯ.

### БУДУЦЬ ВЫНІКІ — БУДЗЕ ПОСПЕХ

Першае, што кідаецца ў вочы, калі наведваеш камбінат хлебапрадуктаў, — гэта адсутнасць пры працуючым абсталяванні абслуговага персаналу. Работнікі сустракаюцца, але даволі рэдка. А гэта сведчанне, што аўтаматызацыя і механізацыя тэхналагічных працэсаў асноўнай вытворчасці дасягае 100 працэнтаў.

Асабліва многа зроблена ў гэтым плане за апошні год.

Разважае **Ірына КАРКОЦКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы, фінансах, уліку і кантролі:**

— Фінансава-эканамічны крызіс закрануў і наша прадпрыемства. Камбінат хлебапрадуктаў хоць і самастойная структура, але цесна звязаны з аграпрамысловым комплексам краіны. Фактычна, гэта адна цэласная сістэма. Таму і зразумела, што камбінат адчувае ўсе негатыўныя ўплывы крызісу на сваёй дзейнасці. І тым не меней у рабоце прадпрыемства ёсць і станоўчыя зрухі — мы не стаялі на месцы. На камбінат прыйшлі інвестары. Радуе, што грошы выдзеліў замежны банк. Тры мільёны еўра паступілі з Германіі на рэканструкцыю млына. Дарэчы, з нямецкім банкам мы мелі справу раней. Сёння млын ужо працуе, і пайшла аддача. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, нам удалося захаваць аб'ёмы рэалізацыі на ўзроўні мінулага года. На тэрыторыі камбіната ўзвялі збожжасховішча на 15 тысяч тон, якое таксама аўтаматызавана. Усталяваны сушыльны комплекс збожжа, які здольны прапусціць 30 тон збожжа ў гадзіну. І гэта не ўсё. Разам з гэтым і праблем хапае. Даводзіцца вытрымліваць канкурэнцыю, працаваць над якасцю прадукцыі, упакоўкай... Цана на прадукцыю ў нас сярэдняя. Адзначу, што нізкая цана выклікае падазрэнне ў пакупніка і таму за лепшае трымацца сярэдзіны. Рынак жытняй мукі перасычаны, і тут беларускія прадпрыемствы канкурыруюць паміж сабой. Амаль 99 % жытняй мукі ідзе на хлебазаводы. Не буду пералічваць усе праблемы, але скажу — пры жорсткай канкурэнцыі многія прадпрыемствы ў нашай галіне могуць не выжыць.

Перамены, якія адбыліся за 2008—2009 гг. на камбінаце хлебапрадуктаў, значныя, але найбольш уражвае рэканструяваны млын гатункавага памолу. Слова **галоўнаму тэхнолагу Алене БАРЫСЕВІЧ:**

— Рэканструкцыя млына была выклікана некалькімі прычынамі. Найперш таму, што абсталяванне састарэла фізічна і маральна. Каэфіцыент зносу дасягнуў амаль 90 працэнтаў. Прадпрыемства не мела магчымасці павялічыць выхад мукі вышэйшага гатунку за кошт зніжэння выхаду мукі 1-га гатунку, а таму не было дадатковага прыбытку. Вытворчыя магчымасці млына не адпавядалі попыту на вырабляемую прадукцыю. Вытворчыя магутнасці млына складалі 60,6 %. Гэтыя і іншыя прычыны прымусілі кіраўніцтва прыступіць да рэканструкцыі млына гатункавага памолу. Пры выбары пастаўшчыка абсталявання ўлічвалася яго дзелавая рэпутацыя, наяўнасць уласнай вытворчай базы, навізна прапанаванага абсталявання і тэхналогіі, гарантыі па абслугоўванні... І ў выніку выбар выпаў на чэшскую фірму Prokop. invest, якая на рынку ўжо больш за 100 гадоў. Пасля ўкаранення ў жыццё мы змаглі павялічыць выхад пшанічнай мукі вышэйшага гатунку да 50—60 %, вырабляць мучныя сумесі, уводзіць сухую клейкавіну, вырабляць шматкі зародкавыя пшанічныя... Важным з'яўляецца і тое, што сёння актуальнае пытанне эканоміі ТЭР вырашана — скараціўся расход электраэнергіі прыкладна на 20 %, а колькасць вытворчага персаналу на 40 %, акрамя гэтага млын абсталяваны ўпаковачнай лініяй для расфасоўкі мучных кампазітных сумесяў у пакеты сучаснага ўзору ад 0,2 да 1 кг, але галоўнае ў тым, што на гэтым абсталяванні можна выпускаць прадукцыю еўрапейскага ўзроўню. І адным з найважнейшых складнікаў праекта рэканструкцыі з'яўляецца ўстаноўка для вытворчасці мучных кампазітных сумесяў. Сёння млын працуе кругласутачна і адпавядае ўсім патрабаванням сусветных стандартаў.

А пра змены на іншых вытворчых участках камбіната хлебапрадуктаў паведаміў **намеснік галоўнага інжынера Дзмітрый АРЦЮХ:**

— На свінакомплексе «Усходні» запушчаны цэх перапрацоўкі гатовай прадукцыі на 115—120 тон у месяц. Не застаўся па-за ўвагай і сельскагаспадарчы ўчастак камбіната. У в. Перхавічы праводзіцца рэканструкцыя малочнатаварнай фермы. Вядзецца падрыхтоўка дакументаў для будаўніцтва фермы ў Лотвічах. Адбываецца рэканструкцыя складоў, навесаў, мехдвара і бытавых памяшканняў у в. Свіраны. Адбылася і мадэрнізацыя лініі вытворчасці алею з рапсу, аб'ёмы вытворчасці якога павялічыліся на 40 %.

За мінулы год былі адчынены крамы ў Баранавічах і Мінску, а ў Калінінградзе (Расія) працуе «Гандлёвы дом» нашага прадпрыемства. Як бачым, зроблена шмат, у аб'екты ўкладзены вялікія грошы і вынік будзе станоўчы.

### ШТО ЯДНАЕ КАЛЕКТЫЎ?

1 верасня 2009 года на птушкафабрыцы «Дружба» адбылася чарговая спартакіяда «Здароўе», у якой спартсмены камбіната хлебапрадуктаў узялі актыўны ўдзел і занялі ў некаторых відах спорту (дартс, настольны тэніс, камбінаваная эстафета) першыя месцы. І ў агульнакамандным заліку каманда камбіната была першай. Пераможцы адзначаны салiднымі грашовымі прэміямі.

А 12 верасня 15 работнікаў прадпрыемства на чале з кіраўніком у рамках праграмы «2009 — Год роднай зямлі» зрабілі 40-кіламетровы велапрабег і наведалі музей-сядзібу Адама Міцкевіча ў Завоссі, помнік герою Беларусі Уладзіміру Карвату ў Арабаўшчыне....

— Такія мерапрыемствы, безумоўна, яднаюць калектыў, — сказала Наталля Манько пасля велапрабегу.

А яшчэ на прадпрыемстве была традыцыйная сустрэча кіраўніцтва з ветэранамі камбіната, якіх сёння 860 чалавек. І кожны пенсіянер атрымаў у падарунак святочны набор.

У гэтым жа годзе, упершыню на камбінаце, выбралі сваю міс — самую прыгожую дзяўчыну.

### У ПАКУПНІКОЎ ЁСЦЬ ВЫБАР

Асноўны рынак збыту прадукцыі камбіната — унутраны рынак Беларусі. Асноўнымі спажыўцамі выступаюць хлебазаводы, прадпрыемствы грамадскага харчавання, гандаль, а таксама сельгаскааператывы некаторых раёнаў Брэстчыны.

І калі мука, галоўным чынам, паступае на прадпрыемствы хлебавыпякання, спажыўтаварыствы, гандлёвыя прадпрыемствы, то асноўнымі спажыўцамі камбікармоў з'яўляюцца прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу.

Частка прадукцыі камбіната пастаўляецца і прыватным гандлёвым прадпрыемствам, у гандлёвую сетку, рэалізацыя адбываецца і праз дыстрыб'ютарскую сетку, а гэта дае магчымасць рэалізацыі дастатковага аб'ёму мукамольнай і камбікормавай прадукцыі ў прыватным сектары рынку сельскай мясцовасці і прыгарадзе.

ААТ «Баранавічхлебапрадукт» вырабляе прадукцыю на сучасным абсталяванні з выкарыстаннем перадавых тэхналогій. А гэта дало магчымасць выпускаць муку і камбікорм самага шырокага асартыменту:

- муку пшанічную «экстра»;
- муку пшанічную вышэйшага, першага і другога гатункаў;
- муку жытнюю хлебапякарную (сеяную, абдзірную, абойную);
- крупу манную.
- вотруб'е пшанічнае харчовае;
- крупку пшанічную дробленую;
- шматкі зародкавыя пшанічныя.

Галоўныя спецыялісты камбіната пастаянна працуюць над удасканальваннем тэхналогіі, а спецыялісты аддзела маркетынгу з мэтай выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і вызначэння запатрабаванняў рынку праводзяць маркетынгавыя даследаванні. А гэта дае магчымасць распрацоўваць і асвойваць новыя віды прадукцыі. У выніку былі выпушчаны наступныя мучныя сумесі:

- мука для аладак (вышэйшага і першага гатункаў);
- мука для бліноў (вышэйшага і першага гатункаў);
- мука для прыгатавання кексаў (сумесь «Залаты гаспадар»);
- мука для выпечкі бісквіту (сумесь «Святочны гаспадар»);
- мука для выпечкі піцы дражджавой («Піца-чараўніца»);
- мука для выпечкі піцы звычайнай («Піца-дачніца»);
- пончыкі дражджавыя.

Мука расфасоўваецца ў прапіленавыя мяхі па 50, 20 і 10 кг. А для аптовага і рознічнага гандлю мука фасуецца ў папяровыя пакеты па 1 і 2 кг, поліэтыленавыя — па 2,5 і 5 кг. Мучныя сумесі фасуюцца па 0,5 кг.

Цяпер вядуцца работы па распрацоўцы рэцэптуры прыкладна 15 відаў новай прадукцыі з Магілёўскім РУП, у тым ліку і актуальных для здаровага харчавання пад маркай «Скарбонка здароўя», якія неўзабаве можна будзе ўбачыць на прылаўках крамаў.

Што датычыцца камбікармоў, то яны выпускаюцца для ўсіх відаў жывёлы і птушак:

- поўнарацыённы камбікорм СК-16 для кармлення парасят ва ўзросце 43—60 дзён, які дазваляе атрымліваць прыбаўленне ў вазе 400 грамаў у суткі;
- поўнарацыённы камбікорм СК-21 для кармлення парасят ва ўзросце 61—104 дні;
- поўнарацыённы камбікорм СК-26 для адкорму свіней. Прыбаўляць ад СК-26 жывёла можа да 650 грамаў у суткі;
- камбікорм-канцэнтрат КК-55 і кармавая сумесь КС-55 прызначаюцца для адкорму свіней да сальнай кандыцыі;
- камбікорм паўнацэнны ПК-5 ідзе для адкорму бройлераў 1—30 дзён;
- камбікормам паўнацэнным ПК-6 адкормліваюць бройлераў з 31-га па 49-ы дзень, а ПК-3 ужываецца для маладняку з 61-га па 120-ы дзень;
- камбікорм К-111 выкарыстоўваецца для сажалкавай карпавай рыбы;
- поўнарацыённы камбікорм ПК-93 для гадоўлі і адкорму трусоў з 28 сутак і старэйшых, дае прыбаўкі ў вазе 30 грамаў у суткі;
- камбікорм для сабак ПК-150, у які ўваходзяць пяць асноўных і самых важных для сабак пажыўных рэчываў: бялкі, тлушч і вугляводы, мінеральныя рэчывы і вітаміны.

Камбінатам выпускаюцца і кармавыя дабаўкі (ДК) для жывёлы і птушак. ДК уяўляе сабой сумесь кампанентаў, узбагачаных вітамінамі і мінеральнымі рэчамі.

Нельга не звярнуць увагу і на такую навінку, як прарошчаная пшаніца «Зярняткі здароў'я». Прарошчанае зерне багатае на амінакіслоты, вітаміны, макра- і мікраэлементы, раслінныя валокны. Яны спрыяюць выдаленню з арганізма таксінаў, канцэрагенаў, радыенуклідаў... звязваюць і выводзяць з арганізма халестэрын, затарможваюць працэсы старэння.

А без жыта ў палатняных торбачках сёння на вяселлі не абысціся. Кідаць жыта на маладых — гэта добрая народная традыцыя.

**НАШЫ КААРДЫНАТЫ:**

ААТ «Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў»
г. Баранавічы,
вул. 50 год БССР, 21
т./ф.: (0163)41 76 68, 41 76 80
**www.gaspadar.net**


У фірмовай краме прадаўцы Ірына СТАСЮКЕВІЧ і Ірына ФЯДОСІК.


Сімвал прадпрыемства — млын.



15-я міжнародная спецыялізаваная аптовая выстава-кірмаш «Прадэкспа-2009». Тэхнолаг аддзела маркетынгу Ніна ШАЛЕСНАЯ і менеджар Алена КАВАЛЕВІЧ.



**Матэрыял падрыхтавалі: Алена ДАЎЖАНОК, Сымон СВІСТУНОВІЧ. Здымкі Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 200166738.

# СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

УНП 100745627.

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское унитарное промышленное предприятие «Борисовский завод «Автогидроусилитель» (РУПП «Борисовский завод «Автогидроусилитель»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Молодечненская птицефабрика» (РУСПП «Молодечненская птицефабрика»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Глубокский комбикормовый завод» (РУСПП «Глубокский комбикормовый завод»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Гомельский радиозавод имени 60- летия СССР» (РУП «Гомельский радиозавод имени 60- летия СССР»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Слуцкий завод «Эмальпосуда» (РУП «Слуцкий завод «Эмальпосуда»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное научно-производственное предприятие «Витебский завод радиодеталей «Монолит» (РУП «Витебский завод «Монолит»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское сельскохозяйственное унитарное предприятие совхоз «Ловжанский» (РСУП совхоз «Ловжанский»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес | 222518, Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 56 | 222323, Минская область, Молодечненский район, агрогородок Олехновичи, ул. Радошковичская, 43 | 211800, Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 142 | 246027, г. Гомель, ул. Объездная, 9 | 223610, Минская область, г. Слуцк, ул. Комсомольская, 14 | 210604, г. Витебск, ул. М. Горького, 145 | 211280, Витебская область, Шумилинский район, д. Никитиха, ул. Витебская, 32а |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Производство механизмов рулевого управления, гидравлических систем, насосов, общемашиностроительных узлов и деталей | Разведение птицы на мясо | Производство готовых кормов для животных, содержащихся на фермах | Производство теле- и радиоаппаратуры для телефонной и кабельной телеграфной связи | Производство санитарно-технических изделий | Производство изделий электронной техники | Мясо-молочная деятельность |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 |
| Численность работающих, чел. | 5 081 | 449 | 380 | 1004 | 1002 | 282 | 334 |
| Срок предъявлений претензий | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб. | 123 690 732 000 | 30 486 077 600 | 23 875 654 000 | 60 426 924 800 | 34 411 828 000 | 5 961 366 400 | 31 106 732 800 |
| Стоимость основных фондов – всего, руб. | 90 647 266 421 | 29 365 440 008 | 32 901 679 278 | 66 013 380 877 | 30 975 444 149 | 3 921 970 215 | 33 299 731 973 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 1 887,4885 | 4366,1 | 73,06 | 62,0429 | 26,6793 | 3,738 | 8577,23 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб. | 1 711 727 | нет | нет | 3 303 362 | 3 186 370 | нет | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб. | нет | нет | нет | нет | 119 108 184 | нет | нет |
| Финансовое состояние объекта, руб.: Балансовая прибыль | 20 231 065 509 | 167 560 348 | -54 143 592 | -1 901 280 286 | 3 186 439 160 | 450 706 990 | 983 424 563 |
| Задолженность: Кредиторская | 23 576 877 111 | 10 501 466 472 | 12 915 999 659 | 18 759 648 271 | 2 619 006 352 | 3 087 063 957 | 14 846 919 183 |
| Задолженность: Дебиторская | 6 466 097 352 | 1 134 141 574 | 11 568 521 139 | 578 961 658 | 940 093 702 | 516 929 943 | 820 093 090 |

| Республиканское унитарное сельскохозяйственное предприятие «Совхоз-комбинат «Мир» («Совхоз-комбинат «Мир»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Торговый дом «Белресурсы» (Государственное унитарное предприятие «Торговый дом «Белресурсы»), Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское торгово-производственное унитарное предприятие «Барановичиметаллоптторг» (РУП «Барановичиметаллоптторг»), Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Витебское межрайонное ремонтное предприятие» (РУПП «Витебское МРП»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Смиловичская валяльно-войлочная фабрика» (РУП «Смиловичская валяльно-войлочная фабрика»), Концерн «Беллегпром» | Республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Автобусный парк № 6» республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гомельоблавтотранс» (РДАУП «АП-6» РАУП «Гомельоблавтотранс»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | 1. Производственное республиканское унитарное предприятие «ЗАВОД «ЭЛЕКТРОНИКА» (РУП «ЗАВОД «ЭЛЕКТРОНИКА»), 2. Торговое республиканское дочернее унитарное предприятие «НЭЧ» (УП «НЭЧ»), 3. Республиканское научно-производственное унитарное предприятие «СКБ НЕМИГА» (РУП «СКБ НЕМИГА») Министерство промышленности Республики Беларусь | 1. Республиканское унитарное предприятие «Витебский завод электроизмерительных приборов» (РУ «ВЗЭП»), 2. Дочернее республиканское унитарное научно-производственное предприятие «Точприбор» (ДРУНПП «Точприбор»), Министерство промышленности Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 225341, Брестская область, Барановичский район, пос. Мир | 220099, г. Минск, ул. Казинца, 2, ком. 610 | 225320, Брестская область, г. Барановичи, Слонимское шоссе, 1-ый км | 210013, г. Витебск, ул. Сивакова, 12 | 223216, Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. Республиканская, 47 | 246015, г. Гомель, ул. Федюнинского, 25 | 1. 220108, г. Минск, ул. Корженевского, 14<br>2. 220108, г. Минск, ул. Корженевского, 14<br>3. 220108, г. Минск, ул. Корженевского, 14, ком. 9 | 1. 210630, г. Витебск, ул. Ильинского, 19-18<br>2. 210033, г. Витебск, ул. Фрунзе, 35 |
| Сельское хозяйство, производство молока, мяса говядины, выращивание кормовых культур, зерна, сахарной свеклы, выращивание лошадей белорусской упряжной породы | Оптовая торговля | Оптовая торговля металлопрокатом, производство изделий из металла по разовым заказам населения и предприятий Республики Беларусь, представление услуг юридическим и физическим лицам | Производство сельскохозяйственных машин | Производство валяльно-войлочных изделий | Пассажирские и грузовые перевозки, техническое обслуживание, ремонт, диагностика автотранспортных средств | Производство электронно-вычислительных машин и другого оборудования для обработки информации, оптовая и розничная торговля товарами народного потребления, проведение экспериментальных разработок и производство часов настенных | Производство средств измерений и контрольно-измерительных приборов |
| Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение |
| 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Брестский областной территориальный фонд государственного имущества, 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества, 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| 513 | 178 | 120 | 90 | 118 | 1 035 | 471 | 1 651 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 74 973 940 800 | 6 347 422 400 | 4 327 228 400 | 2 747 575 600 | 3 443 066 000 | 27 428 569 627 | 41 448 246 400 | 29 107 408 |
| 64 628 633 793 | 4 741 486 130 | 4 199 916 364 | 1 741 478 118 | 3 019 702 982 | 44 217 336 344 | 31 496 163 390 | 24 555 961 |
| 7679,77 | 17,4401 | 18,6517 | 2,6327 | 4,8375 | 17,7278 | 4,127 | 0,48 |
| 888 397 397 | 281 404 | нет | нет | нет | нет | 3 617 119 | нет |
| нет | нет | нет | 9 014 599 | нет | нет | нет | нет |
| 4 074 493 315 | 2 750 026 745 | 308 698 752 | 48 973 631 | -25 510 286 | 563 465 951 | 1 565 183 623 | 5 385 000 |
| 5 731 455 354 | 46 566 316 978 | 2 104 517 441 | 1 098 188 057 | 808 599 408 | 1 263 982 321 | 23 532 021 955 | 8 676 000 |
| 1 060 876 469 | 2 867 100 900 | 2 654 790 | 826 166 468 | 6 506 047 | 820 892 915 | 354 135 879 | 869 000 |

| Республиканское унитарное предприятие «Молодечненский станкостроительный завод» (РУП «Молодечненский станкостроительный завод»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Витязь» (РУПП «Витязь»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Мебельная фабрика «Восход» (РУПП «Мебельная фабрика «Восход»), Министерство торговли Республики Беларусь | Республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Автобусный парк № 1» (РДАУП «Автобусный парк № 1»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное производственное предприятие «Белорусский автомобильный завод» (РУПП «Белорусский автомобильный завод»), Министерство промышленности Республики Беларусь | Республиканское унитарное предприятие «Минский промышленно-торговый комбинат «Верас» (РУП МПТК «Верас»), Концерн «Беллегпром» | Научно-исследовательское республиканское унитарное предприятие «ЦНИИТУ» (УП «ЦНИИТУ»), Министерство промышленности Республики Беларусь | 1. Производственно-торговое республиканское унитарное предприятие «Гарант» (РУП «Гарант»), 2. Дочернее унитарное предприятие «Слуцкий техно-торговый «Гарант» Производственно-торгового республиканского унитарного предприятия «Гарант» (ДУП «Слуцкий техно-торговый «Гарант» РУП «Гарант») Министерство промышленности Республики Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 223310, г. Молодечно, ул. Замковая, 19 | 210605, г. Витебск, ул. П.Бровки, 13а | 223034, Минский район, д. Острошицкий Городок, ул. Ленина, 1 | 246043, г. Гомель, ул. Барыкина, 134 | 222160, Минская область, г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 4 | 220007, г. Минск, ул. Левкова, 9 | 220108, г. Минск, пр. Партизанский, д. 2, к.4 | 1. 220036, г. Минск, ул. Волоха, 1<br>2. 223610, г. Слуцк, ул. Комсомольская, 5А |
| Производство станков, редуктора для сельскохозяйственных машин | Производство телевизионных приемников цветного изображения | Изготовление и ремонт мебели | Пассажирские и грузовые перевозки | Разработка, производство и сбыт карьерных самосвалов большой и особо большой грузоподъемности, автомобильных прицепов, погрузчиков, бульдозеров и запасных частей к ним, выпуск товаров народного потребления | Производство швейных изделий, текстильной галантереи, упаковочной тары, банковой продукции | Наука и научное обслуживание, производство ЭВМ и другого оборудования для обработки информации | Ремонт бытовой радиоэлектронной аппаратуры, электросвязь |
| Не занимает доминирующее положение | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Занимает доминирующее положение | Занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение | Не занимает доминирующее положение |
| 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский областной территориальный фонд государственного имущества 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 | Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8 |
| 183 | 4 309 | 45 | 1 168 | 12 388 | 130 | 216 | 117 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 10 334 588 000 | 256 698 000 | 3 251 151 200 | 22 102 106 400 | 1 281 769 280 000 | 5 434 605 685 | 3 572 509 600 | 1 388 916 600 |
| 10 761 409 417 | 153 949 283 | 3 251 148 550 | 27 981 608 091 | 498 856 635 917 | 2 200 000 000 | 2 172 406 799 | 1 408 204 102 |
| 5,0516 | 110,3014 | 1,3332 | 13,0985 | 4 449,718 | 1,29 | 0,5535 | 0,8580 |
| 82 336 429 | 341 133 | нет | 90 252 000 | 10 041 519 205 | нет | 42 675 000 | 2 678 228 |
| нет | 1 199 693 | нет | нет | 120 286 016 | нет | нет | нет |
| 164 237 483 | 3 325 604 | 927 733 | 15 482 152 | 111 606 000 000 | -102 000 000 | 54 285 394 | 11 979 420 |
| 1 465 773 869 | 14 827 150 | 181 270 316 | 1 332 685 829 | 189 308 214 217 | 401 000 000 | 914 555 017 | 384 503 418 |
| 16 489 885 | 59 261 621 | 110 655 763 | 1 748 607 011 | 156 853 222 077 | 299 000 000 | 832 523 219 | 69 166 167 |

| Республиканское автотранспортное унитарное предприятия «Гроднооблавтотранс» совместно с 19 дочерними предприятиями (дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 1» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 2» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 4» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 5» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 6 «Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 8» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 9» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 11» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 12» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 13» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 14» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 16» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 17» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автомобильный парк № 18» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 2» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 3» г. Слоним Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 4» г. Волковыск Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 5» Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», республиканское производственное дочернее унитарное предприятие «Гродненский автомобильный парк № 3») (РАТУП «Гроднооблавтотранс»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское автотранспортное унитарное предприятия «Гомельоблавтотранс» совместно с 17 дочерними автотранспортными унитарными предприятиями (республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Автобусный парк № 2», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Автобусный парк № 3», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Автобусный парк № 5», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-5», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-9», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП № 10», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-12», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-14», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-15», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП № 16», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП № 17», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-18», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-19», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП-20», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «АТУП № 23», республиканское дочернее автотранспортное унитарное предприятие «Жлобинавтотранс», республиканское дочернее ремонтно-строительное унитарное предприятие «Стройучасток» республиканского автотранспортного предприятия «Гомельоблавтотранс»(РАУП «Гомельоблавтотранс»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь | Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Птицефабрика «Победа» (РУСПП «Птицефабрика «Победа»), совместно с дочерним торговым унитарным предприятием «Птушка» Республиканского унитарного сельскохозяйственного производственного предприятия «Птицефабрика «Победа» (ДТУП «Птушка» РУСПП «Птицефабрика «Победа»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
|---|---|---|
| 230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 25 | 246027, г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 7а | 223130, Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, административное здание № 523 |
| Перевозки автобусами, деятельность автомобильного грузового транспорта, перевозки прочими видами транспорта, подчиняющегося расписанию, транспортная обработка грузов, посреднические услуги в области транспорта, техническое обслуживание и ремонт автомобилей, услуги автомобильных стоянок | Пассажирские и грузовые перевозки | Разведение сельскохозяйственной птицы, разведение крупного рогатого скота, оптовая и розничная торговля мясом и мясными продуктами |
| Не занимает доминирующее положение | Занимают доминирующее положение дочерние автотранспортные унитарные предприятия | Не занимает доминирующее положение |
| 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. | 4 квартал 2009 г. |
| Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества | Создание открытого акционерного общества |
| Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| 1 080 | 3 362 | 212 |
| Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования | Месяц со дня опубликования |
| 109 431 467 200 | 91 011 280 800 | 4 187 616 400 |
| 108 452 529 030 | 116 134 544 987 | 6 683 121 826 |
| 130,7908 | 25,3701 | 3 014,25 |
| 22 380 000 943 | 21 361 040 | нет |
| нет | нет | 505 287 |
| 3 028 528 186 | 1 815 051 914 | -66 663 455 |
| 7 280 884 939 | 7 098 553 738 | 4 906 908 482 |
| 6 655 886 721 | 5 139 981 935 | 818 153 090 |

